УДК 338.45 (476)

**Аб некаторых аспектах вонкаваэканамічнай дзейнасці айчынных прамысловых прадпрыемстваў**

Яфімаў А.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Аналіз агульных вынікаў працы суб’ектаў беларускай прамысловасці на замежных рынках у мінулым 2012 годзе ў чарговы раз дэманструе іх значную залежнасць ад стану кан’юнктуры расійскага рынку. Так, вага Расіі ў вонкавым гандлі нашай краіны склала 47,4%, а ў экспарце ў прыватнасці – 35,41%. Гэтыя лічбы з’яўляюцца вынікам доўгагадовай, фактычна аднабаковай арыентацыі айчынных таваравытворцаў на паглыбленне гаспадарчых сувязяў з краінамі СНД, а найперш – Расіяй.

Стратэгію аднаўлення такіх узаемаадносінаў дзеля замацавання раней складзеных у савецкія часы перспектыўных сувязяў можна зразумець, але стратэгічнае ўзаемадзеянне з Расіяй у гэтай сферы для нашай краіны нясе больш мінусаў, чым плюсаў. Аніводная краіна Усходняй Еўропы не пайшла на такі крок. Ні Літва, ні Латвія, ні Эстонія, ні Малдова, ні нават Украіна. Таму і для нас прыярытэтным павінен быць еўрапейскі вектар развіцця.

Залежнасць паставак машынабудаўнічай прадукцыі ў Расію яшчэ больш значная, чым у вонкавым гандлі агулам. Так, сядзельных цягачоў туды адпраўлена 93,23% ад усіх экспартаваных, грузавікоў – 82,63%, сельскагаспадарчай тэхнікі – 77,78%, часткаў і дэталяў аўтамабіляў і трактараў – 64,5%, саміх трактараў – 53,45%.

Што трэба рабіць, каб дыверсіфікаваць пастаўкі айчыннай прадукцыі?

Надзённай неабходнасцю з’яўляецца ўступ нашай краіны ў СГА. Перамовы вядуцца ажно з 1993 года, а выніку пакуль няма. Нягледзячы на аптымістычныя заявы адмысловых чыноўнікаў, якія кожны год абяцаюць гэты ўступ, эксперты кажуць, што Беларусь не прайшла яшчэ і паўшляху.

Дзеля гэтага, у сваю чаргу, трэба правесці неабходныя гаспадарчыя пераўтварэнні, каб Беларусь была прызнана краінай з рынкавай эканомікай. Па-ранейшаму, большасць прамысловых прадпрыемстваў знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы. Пераважная большасць з іх захавана. Гэта не можа стварыць неабходныя умовы для падвышэння эфектыўнасці развіцця прамысловых суб’ектаў гаспадарання. Як вядома, дзяржава – дрэнны ўласнік. Гэта пацвярджае і досвед нашай краіны. Па ацэнках экспертаў, толькі каля ⅓ усіх прадпрыемстваў маюць добрыя перспектывы развіцця, а астатнія давядзецца альбо прадаць, альбо ліквідаваць, каб не марнаваць сродкі на падтрыманне іх дзейнасці.

Падводзячы высновы, можна выказаць спадзяванні, что лепшыя часы для ВЭД Беларусі яшчэ наперадзе.